# § 26. Развіццё феадальных адносін у Вялікім Княстве Літоўскім

ПРЫВІЛЕЙ КАЗІМІРА
САСЛОЎЕ ЗЕМЛЕЎЛАДАЛЬНІКІ
ДУХАВЕНСТВА МЯШЧАНСТВА
ЗЕМЛЕКАРЫСТАЛЬНІКІ
СЯЛЯНСТВА ПРЫГОННАЕ ПРАВА
ШЛЯХТА ФЕАДАЛІЗМ

**1. Пазямельныя адносіны ў ВКЛ.** У XIV–XV стст. на тэрыторыі Беларусі працягваўся працэс фарміравання феадальных адносін, які пачаўся яшчэ ў старажытнарускія часы. Эканамічнай асновай феадальнага грамадства ў Вялікім Княстве Літоўскім, як і ў цэлым у Еўропе, была ўласнасць на зямлю. Зямля з'яўлялася асноўнай каштоўнасцю, і права на валоданне ёю вызначала становішча чалавека ў грамадстве. Вярхоўным уласнікам і распарадчыкам зямлі ў ВКЛ быў вялікі князь (гаспадар). Апроч асабістых уладанняў ён кантраляваў усе дзяржаўныя землі. Напрыканцы XIV ст. за кошт ліквідацыі буйны́х удзельных княстваў і ўвядзення намесніцтва фонд дзяржаўных зямель значна павялічыўся і склаў каля 70 % тэрыторыі ВКЛ.

**Дзяржаўнае землеўладанне**

Успомніце, што такое феадалізм. Што для яго характэрна?

За выкананне дзяржаўнай службы, удзел у абароне краіны, за асаблівыя заслугі вялікі князь раздаваў феадалам землі з сялянамі. Адной з пашыраных формаў феадальнага землеўладання былі «выслугі» — маёнткі, якія даваліся вялікім князем на розных умовах. Буйны́м феадалам маёнткі звычайна дараваліся *«на вечнасць»* — з правам перадачы

**Раздача дзяржаўных зямель за службу і заслугі**

ў спадчыну, што адпавядала еўрапейскаму феоду. Дробным феадалам выслугі даваліся *«да жывата»*, то-бок на час жыцця ўладальніка. Паводле свайго статусу такія маёнткі адпавядалі сярэдневяковаму заходнееўрапейскаму бенефіцыю. Цягам XV ст. вялікія князі паступова раздавалі зямельныя рэсурсы, у выніку чаго да XVI ст. ужо каля паловы зямельнага фонду дзяржавы знаходзілася ў руках свецкіх і духоўных феадалаў.

Выкажыце здагадку, што маглі азначаць выслугі «да двух жыватоў», «да трох жыватоў».

**Прыватнае землеўладанне**

Апроч велікакняжацкіх уладанняў існавалі вотчынныя маёнткі, якія перадаваліся ў спадчыну і з'яўляліся прыватнай уласнасцю феадалаў. Вялікі князь захоўваў у дачыненні да іх толькі права вярхоўнага кіраўніка дзяржавы. Іх уладальнікі самастойна кіравалі сваімі землямі, раздавалі іх васалам за вайсковую і адміністрацыйную службу. У асноўным вотчынныя маёнткі належалі нашчадкам князёў з дынастый Рурыкавічаў і Гедымінавічаў. Шмат якія з іх у далейшым пашырыліся за кошт падараванняў вялікага князя.

Павелічэнне феадальнага землеўладання ажыццяўлялася і ў выніку куплі-продажу зямлі.

**Царкоўнае землеўладанне**

Асаблівым відам землеўладання было царкоўнае. Манастыры, цэрквы, касцёлы ўвесь час пашыралі свае ўладанні за кошт падараванняў з боку вялікага князя, падарункаў і ахвяраванняў свецкіх феадалаў. Асноўныя зямельныя рэсурсы праваслаўнай царквы сфарміраваліся ў часы Старажытнай Русі і павялічыліся ў XV–XVI стст. у асноўным дзякуючы ахвяраванням праваслаўных магнатаў. Маштабы ахвяраванняў каталіцкай царквы, асабліва з боку вялікіх князёў, пасля заключэння Крэўскай уніі былі значна большыя, у выніку чаго яе зямельныя ўладанні ў XVI ст. удвая перасягнулі зямельную ўласнасць праваслаўнай царквы. У адрозненне ад заходнееўрапейскіх краін царкоўнае землеўладанне ў ВКЛ значнага пашырэння не атрымала.

Ператварэнне сялян у землекарыстальнікаў

Рост феадальнага землеўладання істотна паўплываў на асноўную частку насельніцтва ВКЛ. Яго жыхары паступова страчвалі права валодання зямлёй, ператвараліся з землеўладальнікаў у землекарыстальнікаў. Сям'я селяніна з сядзібай, інвентаром і зямельным надзелам складала асобную гаспадарку, якую ў той час называлі *дымам*. Дымы адной вёскі ўтваралі абшчыну *(грамаду)*. У яе супольным карыстанні знаходзіліся пашы, сенакосы, лясы, дадатковыя ворныя землі. Абшчына не толькі забяспечвала выкананне феадальных павіннасцей, але і бараніла сялян ад самавольства феадалаў, арганізоўвала іх жыццё. Адказнасць абшчыны перад феадаламі і дзяржавай забяспечвалася кругавой парукай.

Падзел грамадства на саслоўі

**2. Саслоўі феадальнага грамадства: правы, абавязкі і прывілеі.** Развіццё феадальных адносін адбывалася разам з падзелам грамадства на *саслоўі*. Працэс фарміравання саслоўнага грамадства на тэрыторыі Беларусі пачаўся яшчэ ў старажытнарускі перыяд, а завяршыўся ў XVI ст., калі канчаткова сфарміраваліся шляхецкае (рыцарскае) саслоўе, духавенства, мяшчанства і сялянства.

Успомніце, што такое саслоўе.

| Саслоўная структура ВКЛ | | | |
|---|---|---|---|
| Прывілеяваныя саслоўі | | Падатковыя саслоўі | |
| шляхта | духавенства | мяшчанства | сялянства |

Правы, абавязкі і прывілеі шляхты

Пануючае становішча ў дзяржаве займала феадальнае саслоўе — *шляхта* (да XV ст. называлася баярамі), юрыдычны статус якой быў замацаваны ў велікакняжацкіх прывілеях 1387, 1432, 1434, 1447 гг., Статутах ВКЛ. Прадстаўнікі гэтага саслоўя вызваляліся ад значнай часткі павіннасцей на карысць дзяржавы, галоўным іх абавязкам з'яўлялася ваенная служба. За нясенне службы шляхта атрымоўвала землі, права суду над сваімі падданымі. У шляхецкім саслоўі аб'ядналіся нашчадкі старажыт-

Бытаваў выраз: «Шляхціц шляхціцу брат». Што ён значыў?

Успомніце, якія феадальныя тытулы існавалі ў Заходняй Еўропе.

нарускіх і літоўскіх князёў і баярства, а таксама сялян і мяшчан, продкі якіх рашэннем гасудара атрымалі шляхецкае званне за свае заслугі. Фармальна ў палітычных правах усе шляхціцы былі роўныя, але эканамічны іх стан быў вельмі розны. У адрозненне ад заходнееўрапейскіх краін у ВКЛ не склалася феадальнай лесвіцы з сістэмай васальна-сеньёрыяльнага падпарадкавання. Тым не менш вылучалася некалькі катэгорый феадалаў ВКЛ. Рэальнай палітычнай сілай былі *магнаты* (ад лац. *magnus* — вялікі), што валодалі велізарнымі зямельнымі надзеламі, тысячамі залежных сялян, а пазней і гарадамі. Яны мелі ўласныя войскі і варагавалі не толькі паміж сабой, але і з вялікім князем. Да магнатаў належалі арыстакратыя і нетытулаваная знаць. Да князёў належалі нашчадкі княжацкіх дынастый Рурыкавічаў і Гедымінавічаў, да паноў — буйны́я феадалы, што атрымалі свае ўладанні і тытул не па праве нараджэння, а за пэўныя заслугі перад вялікім князем.

Асаблівасцю ВКЛ у параўнанні з многімі заходнееўрапейскімі краінамі была вялікая ўдзельная вага шляхты — 8–10 % ад усяго насельніцтва, што тлумачылася неабходнасцю гарантавання ваеннай бяспекі краіны.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



1. *Прадстаўнікі якога саслоўя выяўлены на ілюстрацыі? Паводле якіх прыкмет вы гэта вызначылі?*
2. *Які дакумент паклаў пачатак прававому афармленню дадзенага саслоўя? Калі і кім ён быў прыняты?*
3. *Якія змены ў становішчы прадстаўнікоў гэтага саслоўя адбыліся пасля прыняцця прывілеяў Ягайлы 1432 г. і Жыгімонта Кейстутавіча 1434 г.?*
4. *Назавіце прозвішчы найбольш вядомых прадстаўнікоў гэтага саслоўя, што жылі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIII — XV ст.*

**Духавенства**

Блізкі да шляхты сацыяльна-прававы статус мела *духавенства*, якое ажыццяўляла рэлігійную і культурна-асветную дзейнасць. У ВКЛ адначасова суіснавалі прадстаўнікі духавенства некалькіх канфесій, якія ў розныя гістарычныя перыяды займалі неаднолькавае становішча ў дзяржаве. Праваслаўнае і каталіцкае духавенства мела ўласную іерархічную сістэму. Вышэйшае духавенства паводле свайго статусу адпавядала шляхце, ніжэйшыя катэгорыі духавенства — мяшчанам або сялянам.

| ПРАВАСЛАЎНАЕ ДУХАВЕНСТВА | | КАТАЛІЦКАЕ ДУХАВЕНСТВА |
|---|---|---|
| • Мітрапаліт<br>• Архіепіскапы і епіскапы<br>• Архімандрыты | **Вышэйшае духавенства** | • Прымас<br>• Біскупы<br>• Абаты |
| • Святары<br>• Дыяканы, манахі | **Ніжэйшае духавенства** | • Святары<br>• Дыяканы, манахі |

**Мяшчанства**

У гарадах фарміравалася мяшчанства (ад старабел. «места» — горад), якое ўключала ў сябе рамеснікаў, купцоў і іншыя катэгорыі гараджан. Правы і абавязкі мяшчан вызначаліся велікакняжацкімі прывілеямі і Статутамі ВКЛ. Мяшчане валодалі асабістай свабодай, правам перасялення ў іншыя гарады, некаторыя служылі ў арміі; там, дзе існавала магдэбургскае права, яны непасрэдна ўдзельнічалі ў працэсе кіравання горадам. У адрозненне ад шляхты і духавенства мяшчанства з'ўлялася падатковым саслоўем. На працягу XV–XVI стст. узмацнілася неаднароднасць унутры саслоўя і з цягам часу вылучыліся асобныя катэгорыі мяшчан.

| Катэгорыі мяшчан | | |
|---|---|---|
| **Вышэйшы пласт** | **Сярэдні пласт** *(паспольства)* | **Ніжэйшы пласт** *(чорныя людзі)* |
| вярхушка гарадской адміністрацыі, буйныя купцы, заможныя рамеснікі-майстры, землеўладальнікі | цэхавыя рамеснікі, гандляры, служачыя гарадской адміністрацыі | дробныя гандляры, рамеснікі, што не ўваходзілі ў цэхі (партачы), вучні рамеснікаў, жабракі і да т. п. |

Сялянства — самае шматлікае саслоўе

Самым шматлікім саслоўем было *сялянства*. Колькасць сялян складала 70–80 % ад усяго насельніцтва дзяржавы. Асноўным іх абавязкам з'яўлялася сельскагаспадарчая дзейнасць на карысць дзяржавы і ўладальніка.

Аснова эканомікі ВКЛ — сельская гаспадарка

**3. Шляхі фарміравання залежнага сялянства. Пачатак запрыгоньвання сялян на тэрыторыі Беларусі.** Аснову эканомікі Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XIII — XV ст. складала сельская гаспадарка. Галоўнай прадукцыйнай сілай было сялянства. Асноўнымі заняткамі з'яўляліся земляробства, жывёлагадоўля і сельскае рамяство, а дапаможнымі — бортніцтва, паляванне і рыбалоўства. Вырошчвалі жыта, авёс, ячмень, пшаніцу, грэчку і іншыя культуры. Паступова пашыралася трохпольная сістэма земляробства, але ўраджайнасць заставалася нізкай. Прылады працы для апрацоўкі зямлі (саха і плуг) удасканальваліся вельмі марудна і захоўваліся практычна нязменнымі на працягу стагоддзяў. Цяглай сілай былі валы, пазней коні. Гадавалі таксама свіней, авечак, коз. Сялянская гаспадарка ў цэлым мела натуральны характар. Усё неабходнае для жыцця (прылады працы, посуд, тканіны, адзенне, абутак) сем'і выраблялі самастойна.

Формы зямельнай рэнты

З ростам феадальнага землеўладання сялянства траціла права распараджэння зямлёй і ператваралася ў землекарыстальнікаў. З XIII ст. сяляне, якія распараджаліся зямлёй вялікага князя (гаспадара), пры-

ватных асоб (князёў, баяр, шляхты) і царквы, залежалі ад іх эканамічна і юрыдычна, плацілі ім зямельную рэнту. Формы рэнты былі розныя: *прадуктовая, грашовая, адпрацовачная*. У XI–XIV стст. асноўнай формай феадальных павіннасцей быў прадуктовы аброк — даніна, дзякла. Ад XIV ст. на тэрыторыі Беларусі вядомая адпрацовачная павіннасць — паншчына, аднак вялікае пашырэнне яна атрымала ў XVI ст. З XV ст. феадалы ВКЛ пачалі ўводзіць для сялян грашовы аброк — чынш.

**Катэгорыі сялян у залежнасці ад формы павіннасцей**

Адзінкай падаткаабкладання быў дым. Выходзячы з нормы павіннасцей, сяляне падзяляліся на *даннікаў, цяглых, асадных (чыншавых)* і *сялян-слуг*. Да канца XV ст. асноўнай катэгорыяй сялян былі *даннікі*, галоўнай павіннасцю якіх з'ўлялася даніна. Першапачаткова яе выплачвалі ў выглядзе прамысловых прадуктаў: мёду, воску і футра, пазней — у выглядзе сельскагаспадарчай прадукцыі: збожжа, птушкі, яек, ільну, канапель, сена і іншых прадуктаў. *Цяглыя сяляне* адбывалі паншчыну. Чынш з'яўляўся асноўнай павіннасцю *асадных сялян* (да канца XVI ст. называліся асаднымі, затым чыншавымі). Асобную катэгорыю складалі *сяляне-слугі*, чый сацыяльны статус быў вышэйшы, чым у іншых прадстаўнікоў гэтага саслоўя. Асноўным іх абавязкам была вайсковая служба або выкананне павіннасцей, якія патрабавалі спецыяльных навыкаў.



### Пачатак юрыдычнага афармлення прыгоннага права ў ВКЛ

Паводле ступені феадальнай залежнасці сяляне дзяліліся на тры асноўныя катэгорыі: *«людзей пахожых», «людзей непахожых»* і *«чэлядзь нявольную»*. Апошняя фарміравалася з ліку збяднелых сялян і палонных, яе прадстаўнікі з'яўляліся поўнай уласнасцю феадала, не вялі ўласнай гаспадаркі і жылі ў яго маёнтку. Першапачаткова асноўная маса сялян у ВКЛ былі «пахожымі», г. зн. асабіста свабоднымі. Яны маглі пераходзіць ад аднаго феадала да іншага, але толькі восенню, пасля заканчэння палявых работ, са згоды гаспадара і пасля выплаты ўсіх пазык. Землеўладальнікі імкнуліся замацаваць вольных сялян за сваімі надзеламі: давалі пазыкі, якія сяляне потым не маглі вярнуць; уводзілі выплаты за права пераходу да іншага феадала і г. д. Пастулова павялічвалася катэгорыя феадальна-залежных сялян — «людзей непахожых». Яны былі пазбаўлены права пераходу і з'яўляліся ўласнасцю феадала. Такім чынам складвалася *прыгоннае права*. Пачатак яго афармленню ў ВКЛ паклаў *прывілей Казіміра Ягайлавіча* **1447 г.**, у якім вялікі князь загадаў феадалам не прымаць у сваіх уладаннях сялян, якія збеглі з дзяржаўных маёнткаў. Феадалы таксама атрымалі права вотчыннага суду над сваімі сялянамі. У *Судзебніку Казіміра* **1468 г.** уводзілася пакаранне за дапамогу збеглым сялянам.

Успомніце, што такое прыгоннае права. Калі ў Еўропе пачаўся працэс запрыгоньвання сялян?

Наступныя заканадаўчыя кодэксы замацоўвалі працэс ператварэння вольных сялян у «людзей непахожых». *Статут ВКЛ* **1529 г.** увёў «земскую даўніну» — 10-гадовы перыяд жыцця селяніна на зямлі феадала, пасля якога ён рабіўся «непахожым», а таксама выплату «пажылога» — падатку для тых, хто яшчэ захаваў права пераходу. У выніку працэсу запрыгоньвання сялян, які адбываўся на працягу XV–XVI стст., паступова фарміраваўся адзіны сацыяльны пласт — прыгоннае сялянства.

*Такім чынам, у другой палове XIII — XV ст. у ВКЛ адбываліся сацыяльна-эканамічныя змены, характэрныя для развіцця феадальнага грамадства: узнікла буйное феадальнае землеўладанне, аформіліся саслоўі, пачалося запрыгоньванне сялян.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
| --- | --- |
| XIV–XV стст. — утварылася адзінае дваранскае саслоўе | XIV–XV стст. — у велікакняжацкіх прывілеях замацаваны юрыдычны статус феадальнага саслоўя (шляхты) |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Выкарыстоўваючы тэкст параграфа, складзіце схему «Віды феадальнага землеўладання і шляхі іх фарміравання».
2. На якія саслоўі дзялілася грамадства ВКЛ? Назавіце правы і абавязкі кожнага з іх.
3. На аснове тэксту параграфа і воблака слоў складзіце табліцу «Асноўныя катэгорыі сялян у ВКЛ у XIV–XV стст.». Выкарыстоўваючы табліцу, раскажыце пра становішча сялян.
4. Вылучыце этапы ў запрыгоньванні сялян ВКЛ, ахарактарызуйце іх.
5. Як вы лічыце, чаму працэс запрыгоньвання сялян на тэрыторыі Беларусі пачаўся значна пазней, чым у краінах Заходняй Еўропы?